**Сакалоў, А.** Памяць сэрца / А. Сакалоў // Герой працы (Шуміліна). — 2014. — 14 лют. — С. 4.

# ПАМЯЦЬ СЭРЦА

**Нядаўна ў Башнёўскім сельскім клубе прайшоў вечар-партрэт у гонар палкоўніка Ромаса Юхневічуса. Мерапрыемства прымеркава да 25-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана.**

Ромас Канстанцінавіч Юхневічус – кадравы афіцэр з баявым мінулым, ён узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, Знакам Міністра абароны СССР «За размініраванне», медалём «За баявыя заслугі» і афганскімі «За храбрасць», Зоркі III ступені.

На пачатку вечара-партрэта – аповед пра дзяцінства Р. К. Юхневічуса, пра тое, як літоўскі хлопчык цвёрда вырашыў абраць афіцэрскую сцежку. Пасля вядучая расказвае пра службу ў Забайкаллі, Прыбалтыцы, Афганістане, гартаюцца фотаздымкі з сямейнага архіва Юхневічусаў.

Асаблівая старонка вечара прысвечана афганскаму перыяду службы Ромаса Канстанцінавіча. У 1982 годзе маёра Юхневічуса накіроўваюць ў Пулі-Хумры зампалітам 395-га мотастралковага палка. Ромас Канстанцінавіч расказваў і пра ўзяцце вышыні, і пра вызваленне ад душманаў афганскіх мястэчак… Р. К. Юхневічус падкрэсліў, што як ні было цяжка на вайне, але ў яго быў надзейны тыл – яго сям'я. На вечарыне прысутнічалі жонка Ромаса Канстанцінавіча, яго дачка, унукі.

Старшыня раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» М. А. Калянковіч і намеснік старшыні арганізацыі М. І. Андрэеў адзначылі сталую грамадзянскую пазіцыю Р. К. Юхневічуса, уручылі яму памятны знак, прысвечаны 20-годдзю з дня ўтварэння арганізацыі.

Завяршылася мерапрыемства канцэртам «Памяць сэрца», які падрыхтаваў Башнёўскі сельскі клуб.

**Алесь Сакалоў**